першыя, ні другія не з'яўляюцца іканаграфічна набліжанымі творамі да роспісаў царскай брамы [8].

Падводзячы высновы, у цэлым трэба адзначыць, што пра выкарыстанне гравюр куцеінскіх выданняў як крыніцы беларускага іканапісу даследчыкамі адзначалася досыць часта. Большасць такіх звестак сустракаецца ў публікацыях Н.Ф. Высоцкай, а ўпершыню ў беларускім мастацтвазнаўстве такая думка прагучала больш за 80 гадоў таму ў артыкуле М. Шчакаціхіна. Аднак пры спецыяльным вывучэнні фактычна ніводная версія не пацвердзілася, што ставіць перад даследчыкамі новыя пытанні: чаму ў мастацтвазнаўчай літаратуры так укаранілася меркаванне пра папулярнасць ілюстрацый куцеінскіх выданняў сярод іканапісцаў? І чаму, усё ж, пры такім высокім узроўні куцеінскіх гравюр яны, як паказала дадзенае даследаванне, амаль не выкарыстоўваліся ў якасці крыніцы? Магчыма, далейшая праца ў дадзеным накірунку прывядзе да адказаў на пастаўленыя пытанні, а можа і сапраўды будуць знойдзены бясспрэчныя прыклады ўздзеяння куцеінскіх ілюстрацый на іканапіснае мастацтва.

**Літаратура**


1 Актоіх. – Куцейна: друкарня Багояўленскага манастыра, 1646. (ЦНБ, К 16-18/ Нр 67)[1].

2 Анфалагіён. – Кіеў: друкарня Кіева-Пячэрскай Лаўры, 1619. (НББ, 094/4733).

3 Богагалоснік. – Пачаеў: Лаўрская друкарня, 1825. (ЦНБ, К 16-18/ Нр 26).

4 Высоцкая, Н.Ф. Искусство Беларуси 12-18 вв. / Н. Высоцкая – Мн., 2004. – 26 с.

5 Жывапіс барока Беларусі / аўтар-склад. Н.Ф.Высоцкая. – Мн.: БелЭН; МФКД, 2003. – 304 с.: іл.

6 Іканапіс Беларусі XV – XVIII стагоддзяў / Аўтар тэксту і складальнік Н.Ф.Высоцкая. – Мн.: Беларусь, 2001. – 21 с.: [139] арк. іл.

7 Лаўрык, Ю. Куцеінская друкарня / Ю. Лаўрык // Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т. Т.2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч / Рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. З.Э.Герасімовіч. – Мн.: БелЭн, 2006. – с. 172-173.

8 Новы запавет з псалтырам. – Куцейна: др. Богаяўл. манаст., 1652. (ЦНБ, К16-18/Нр 26).

9 Православная икона России, Украины, Беларуси [электронный ресурс]: виртуальная версия выставки "Православная икона России, Украины, Беларуси" в Национальном художественном музее 30 сентября – 9 ноября 2008 г. – Минск: Национальный художественный музей, 2009. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

10 Растоўскі, Д. Жыцці святых. Т.2. снежань-люты / Дзімітрый Растоўскі. – Кіеў: друкарня Кіева-Пячэрскай Лаўры, 1695. (ЦНБ, К 16-18/ Ср 9).

11 Трыфалагіён. – Куцейна: др. Багаяўленскага манастыра, 1647. (ЦНБ, К16-18/Нр 48).



**Г.П. Харошка** (Віцебск)


## РУПЛІВЫ ЗБІРАЛЬНІК І ДАСЛЕДЧЫК ДУХОУНЫХ СКАРБАЎ ВІЦЕБСКАЙ ЗЯМЛІ

Для многіх пакаленняў беларускай інтэлігенцыі духоўная спадчына продкаў была пуцяводнай зоркай на шляхах яе ўласных творчых пошукаў. Аднак мы яшчэ недаравальна мала ведаем пра жыццё і дзейнасць многіх руплівых збіральнікаў вуснапаэтычных скарбаў. Плён іх працы часткова знішчаны часам, а тое, што засталося ў архівах і рэдкіх выданнях, якія сталі ўжо бібліяграфічнай рэдкасцю, яшчэ не сабрана, не ўпарадкавана і не ўведзена ў шырокі навуковы ўжытак. У дадзеным выпадку мы гаворым пра фалькларыстаў XIX – пачатку XX стагоддзяў, якія ўнеслі значны ўклад у станаўленне і развіццё беларускай фалькларыстыкі як навукі, але на сённяшні дзень іх імёны ака-

[1] Для старадрукаў у дужках пасля бібліяграфічных звестак пазначана бібліятэка і шыфр асобніка, з якім нам непасрэдна і давялося працаваць. ЦНБ – Цэнтральная Навуковая Бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, НББ – Нацыянальная Бібліятэка Беларусі.



Рэпазіторый ВДУ

заліся маладаследаванымі. Сярод іх К.Фалютынскі, І.Храпавіцкі, Т.Заблоцкі, І.Савініч, І.Пачопка, С.Сахараў, Г.Марцінкевіч, І.Гарбачэўскі, А.Пшчолка і інш. Імі былі запісаны шматлікія святы і абрады, песні і павер'і, легенды і паданні Віцебска, Полацка, Лепеля, Суража, Глыбокага, Гарадка, Оршы і іншыя мясцовасцей Віцебшчыны.

Асаблівай увагі заслугоўвае сёння і дзейнасць Ігната Яўстахавіча Храпавіцкага – самабытнага збіральніка і даследчыка народных скарбаў XIX стагоддзя, сапраўднага знаўцы не толькі мясцовай, але беларускай духоўнай і матэрыяльнай культуры ўвогуле.

Нарадзіўся І.Я.Храпавіцкі ў мястэчку Кахановічы Дрысненскага павету Віцебскай губерні (сучасны Верхнядзвінскі раён) 31 ліпеня 1817 года і памёр на Каляды 25 снежня 1893 года, пражыўшы доўгае і змястоўнае жыццё. Адукацыю атрымаў дамашнюю, у доме бацькі – Яўстаха Іосіфавіча – камергера Двара яго імператарскай Вялікасці. Шмат вандраваў, быў Рыме, але большую частку жыцця пражыў у Кахановічах і рана стаў гаспадаром маёнтка.

У 1844 годзе быў абраны на грамадскую пасаду наглядчыкам сельскіх ссыпных магазінаў і тады блізка пазнаёміўся з жыццём сялян. У 1850 годзе Храпавіцкі распрацаваў праект ліквідацыі прыгоннага права і правёў яго на губернскім з'ездзе, які праходзіў у Віцебску. Аднак крамольны праект не атрымаў сілу закона, а яго аўтар аказаўся ў апале, доўгі час быў пазбаўлены магчымасці ўдзельнічаць у грамадска-палітычным жыцці. Пра Храпавіцкага ўспомнілі ў 1858 годзе і ўвялі ў састаў губернскага Камітэта па скасаванні прыгоннага права, дзе ён плённа працаваў каля чатырох гадоў. Быў узнагароджаны за гэта медалём. У 1859 годзе Ігнат Храпавіцкі абіраецца маршалкам дваран Дрысненскага павета, а ў 80-я гады становіцца прадвадзіцелем дваран Віцебскай губерні.

І.Я.Храпавіцкі быў вядомы не толькі як прагрэсіўны грамадскі дзеяч, але і як паэт, фалькларыст, энограф, асветнік. Асаблівую цікавасць І.Храпавіцкі праявіў па зборы і вывучэнні шматаспектнасці фальклору не толькі віцебскага рэгіёну, але і ўсёй Беларусі. Пачынаў сваю дзейнасць з актыўнага супрацоўніцтва з грамадска-палітычным і краязнаўчым часопісам "Рубон" (на старажытнай назве ракі Дзвіна), які выдаваў Казімір Андрэевіч Буйніцкі. Будучы фалькларыст змяшчаў там свае вершы, пераклады, публікаваў гістарычныя дакументы і фальклорныя матэрыялы. Аднак асветніцкая дзейнасць і сентыментальная паэзія прываблівала яго нядоўга. Асноўным полем дзейнасці І.Храпавіцкага становіцца беларускі фальклор. Збіральнік добра ведаў гісторыю беларускага народа, асабліва захапляўся яго вуснапаэтычнай спадчынай. Будучы даследчык цікавіўся аграрным календаром жыхароў Прыдзвіння, захапляўся іх бытам і норавамі. Прываблівалі Храпавіцкага народныя песні, надаючы ім адпаведную сістэматызацыю па відах: зімовыя, жніўныя, купальскія і інш. Вучоны асаблівае значэнне надаваў песні, якая выконвалася ў натуральных умовах, а не спецыяльна, па чыйсці просьбе. Ён лічыў, што песню трэба не толькі чуць, а і бачыць яе ў імправізацыі, калі яе часта суправаджалі танцамі, забавамі. "У той песні і глухі адчуе прывабнасць", - сцвярджаў І.Я.Храпавіцкі. Вось чаму збіральнік любіў рабіць запісы песень у час спеваў, калі можна ацаніць дасканаласць выканання, музычнасць песень, гаварыць аб іх прызначэнні.

І.Я.Храпавіцкі не толькі быў збіральнікам фальклору, а і яго даследчыкам. Пра гэта сведчыць яго навукова-тэарэтычная праца "Погляд на паэзію беларускага народа". Па ацэнцы бібліёграфа Рамуальда Падбярэзскага, гэта быў "першы самастойны філасофскі погляд на паэзію беларускага народа, першае набліжэнне да ўсведамлення сябе ў сутнасці сваёй паэзіі" [1, с.55]. У ёй вучоны дае высокую ацэнку вуснапаэтычнай творчасці беларускага народа ўвогуле. Як прызнаваўся сам Храпавіцкі, "праца ўяўляе сабою ахоп тэмы, пранікненне ў глыбіню і высвятленне паэзіі, песні, глыбокія даследа-

ванні і самыя смелыя высновы пра паэзію простага народу” [2, с.239]. У працы аўтар дастаткова грунтоўна і глыбока аналізуе зімовую, жніўную і купальскую паэзію. Звяртае ён увагу і на лірычныя песні, якія, на яго думку, вызначаюцца дакладнасцю, адраснасцю выканання. Спыняецца даследчык і на адметнасцях паэтычнага стылю, народных твораў: фальклорны гістарызм, паралелізм, сімволіка.

У сваіх тэарэтычных і эстэтычных поглядах на народную творчасць Храпавіцкі зыходзіў з супастаўлення беларускага фальклору з фальклорам іншых народаў, а гэта давала яму права сцвярджаць пра жыццяздольнасць народнага мастацтва і ўплыў яго на літаратуру. Хаця даследчык прапаведваў ідэю разумнага выкарыстання фальклору ў літаратуры, катэгарычна выступіў супраць яго шаблоннасці не толькі ў творчым пераймaнні ў літаратуры, але і ў самім працэсе даследавання.

Тэарэтычная праца І.Я.Храпавіцкага “Погляд на паэзію беларускага народа” мела ў свій час нямалы рэзананс сярод маладых інтэлігентаў Беларусі. Яго праца зрабіла адпаведны ўплыў на наступныя пакаленні вучоных, у прыватнасці на дзейнасць Я.Ф.Карскага. Даследчыцкі вопыт Храпавіцкага аказаўся трывалым і жыццёвым для беларускай фалькларыстыкі. Думкі і палажэнні, выказаныя вучоным, і сёння з’яўляюцца важнымі і актуальнымі.

Такім чынам, жыццёвы і творчы шлях удумлівага фалькларыста з’яўляецца ўзорам сапраўднага патрыятызму, адданасці сваёй Радзіме.

**Літаратура**

1. Салавей Л.М. Ігнат Храпавіцкі – беларускі фалькларыст / Л.Салавей // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1976. - №4. – с.55-57.
2. Храпавіцкі І. Погляд на паэзію беларускага народа / І.Храпавіцкі // Полымя. – 1997. - №9. – с.235-263.

Рэпазіторый ВДУ